РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

УДК 331.108

**А. І. Сцепанцоў**

# ДЫНАМІКА КАДРАЎ КУЛЬТУРЫ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ: 1991–2006 гг.

*Разглядаецца сучасная дынаміка кадравай сістэмы галіны культуры ва ўзаемасувязях з інстытутамі непасрэднай сацыякультурнай работы з насельніцтвам і прафесійнай мастацкай творчасці ў перыяд станаўлення суверэнітэту Рэспублікі Беларусь. Прыводзяцца статыстычныя звесткі апошніх гадоў, якія дазваляюць засведчыць станоўчую дынаміку ўдасканалення кадравага складу арганізацый культуры як выніку мэтанакіраванай дзейнасці кіраўніцкіх органаў культуры па фарміраванні якаснай прафесійна-адукацыйнай асновы кадраў культуры. Зроблены вывад, што кадравы склад сферы культуры забяспечыў*

*не толькі захаванне культурнай прасторы краіны, але і яе якаснае напаўненне. Падкрэслена, што шырокае поле сацыяльна-культурнай дзейнасці патрабуе значнай прафесійнай адказнасці ад работніка культуры, таму такое важнае значэнне надаецца менавіта ўзроўню адукацыі і якасным кваліфікацыям – асноўным характарыстыкам кадраў.*

Аб'ектам даследавання з'яўляюцца кадры галіны культуры Рэспублікі Беларусь, якія ўносяць значны ўклад у сацыяльны прагрэс краіны, задавальняюць асноўныя мастацка-культурныя патрэбы грамадства. Кадры складаюць галоўную прадукцыйную сілу культурнага працэсу, забяспечваюць выніковасць і эфектыўнасць дзейнасці, вырашэнне праблем культурнага развіцця. Спецыялісты культуры арганізоўваюць вольны час насельніцтва і напаўняюць яго шматлікімі відамі і формамі сацыякультурнай дзейнасці, яны з'яўляюцца носьбітамі як пераемных, так і абнаўленчых элементаў мастацкай культуры. Такім чынам, актуальнасць вывучэння працэсаў, якія адбываюцца ў кадравай сістэме, відавочная.

Прадметам даследавання абраны прафесійна-адукацыйны ўзровень спецыялістаў, які адыгрывае вызначальную ролю ў фарміраванні спецыяліста і з'яўляецца значнай перадумовай для ажыццяўлення мастацкай творчасці, характарызуе гатоўнасць спецыялістаў да разнастайнай сацыякультурнай дзейнасці. Вывучэнне прафесійна-адукацыйнага ўзроўню кадраў культуры, выяўляе іх патэнцыял, дазваляе выпрацоўваць арыенціры кадравай палітыкі. Удасканаленне кадравага складу галіны культуры – аснова кіравання на ўсіх узроўнях. Сферы культуры патрабуюцца таленавітыя і шырока адукаваныя работнікі, якія здольны най вайной) і ўдасканаленне культурна-асветнай сістэмы, прафесійнага мастацтва; аднаўленне прафесійнай мастацкай адукацыі як крыніцы папаўнення кадравых рэсурсаў мастацкай творчасці, культурна-забаўляльнай дзейнасці (1944–1975 гг.); 3) узмацненне цэнтраімклівых тэндэнцый да аб'яднання кадравых элементаў у цэласную сістэму, да інтэграцыі ўзаемазвязаных узроўняў адукацыі ў адзіную падсістэму бесперапыннай прафесійнай адукацыі ў сферы культуры (1976–1990 гг.); 4) фарміраванне цэласнай кадравай сістэмы галіны культуры як сукупнасці ўзаема-звязаных складальных: прафесійнай мастацка-вытворчай дзейнасці абагульненых суб'ектаў; бесперапыннай прафесійнай адукацыі ў галіне культуры, здольнай поўнасцю забяспечваць патрэбнасці краіны спецыялістамі; кіруючай падсістэмы, якая арганізуе і каардынуе дзейнасць усёй сукупнай кадравай сістэмы (1991–2006 гг.).

Для нашага даследавання сучаснай кадравай сістэмы галіны культуры абраны шэсць асноўных (з найбольшай колькасцю работнікаў) тыпаў арганізацый культуры: бібліятэкі; клубныя ўстановы; музеі; тэатры; канцэртныя арганізацыі; навучальныя ўстановы. Колькасць устаноў, работнікаў галіны і спецыялістаў (даныя 2006 г.) [1] прыведзены ў параўнальнай табліцы 1.

Табліца 1 – Колькасць устаноў, работнікаў галіны і спецыялістаў

| Катэгорыі | Колькасць устаноў | Колькасць работ-нікаў | Сярэдняя колькасць работнікаў на 1 ўстанову | % ад галіновай колькасці | У тым ліку спецыялісты | Сярэдняя колькасць спецыялістаў на 1 ўстанову | % спецыялістаў ад колькасці работнікаў |
|---|---|---|---|---|---|---|---|
| Клубы | 3 838 | 18 352 | 4,7 | 33,8 | 10 860 | 2,8 | 59,9 |
| Бібліятэкі | 4 215 | 11 934 | 2,8 | 22 | 9 500 | 2,2 | 79,6 |
| Музеі | 138 | 3 133 | 22,7 | 5,4 | 1 140 | 8,2 | 36,3 |
| Тэатры | 28 | 3 374 | 120,5 | 6,4 | 1 594* | 56,9 | 47,3 |
| Канцэртныя арганізацыі | 16 | 2 025 | 112,5 | 3,7 | 1 455* | 80,8 | 72 |
| Навучальныя ўстановы | 533 | 14 242** | 26,7 | 26,2 | 14 242** | 26,7 | 100 |

* мастацка-артыстычны склад
**выкладчыкі ДМШ, ССНУ, ВНУ

творча, прафесійна супрацоўнічаць з людзьмі і валодаюць сур'ёзнай агульнакультурнай падрыхтоўкай.

Сучасная кадравая сістэма сферы культуры ўсталявалася ў працэсе гістарычнага развіцця, які магчыма падзяліць на наступныя этапы: 1) арганізацыя культурна-асветніцкай работы як дзяржаўнай справы, стварэнне адпаведнай структуры культурных інстытутаў, у ліку якіх – прафесійна-адукацыйныя; развіццё кадравай складальнай (1918–1940 гг.); 2) інтэнсіўнае адраджэнне (пасля ўрону, нанесенага Вялікай Айчын-

У клубах і бібліятэках працуе найбольшая колькасць спецыялістаў культуры. Звыш 90 % з іх размешчана ў вёсках, фактычна яны з'яўляюцца адзінымі сацыякультурнымі ўстановамі, своеасаблівымі апорнымі пунктамі культуры, дзейнасць якіх цалкам залежыць ад спецыяліста, яго адукаванасці, арганізатарскіх і мастацкіх здольнасцей.

Разгледзім дынаміку станаўлення і развіцця кадраў сферы культуры, кадравыя змяненні ў зрэзе прафесійна-адукацыйных прымет асобна па асноўных

[1] У артыкуле выкарыстаны статыстычныя даныя БелДІПК розных гадоў



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

катэгорыях культурна-асветных, тэатральна-відовішчных і адукацыйных устаноў.

**Інстытут сацыякультурнай работы з насельніцтвам** – аб'яднанне устаноў, асноўная мэта якіх – спрыяць самаарганізацыі людзей для задавальнення эстэтычных патрэбнасцей. Прафесійныя суб'екты гэтых інстытутаў – кадры культурна-асветных арганізацый: клубаў, бібліятэк, музеяў і паркаў.

Першы радок па колькасці працуючых у статыстычных табліцах займаюць *кадры клубных устаноў*, што складае амаль трэцюю частку (30 %) ад усіх работнікаў культуры. Спецыялісты клубнай работы забяспечваюць арганізацыю культурна-асветнай і святочна-відовішчнай дзейнасці, аматарскай творчасці, гульнёва-забаўляльных зносін – асноўных напрамкаў у арганізацыі вольнага часу насельніцтва. Яны садзейнічаюць фарміраванню эстэтычных поглядаў, патрыятычнаму і працоўнаму выхаванню маладога пакалення. Мерапрыемствы, набліжаныя да людзей: святы вёсак, горадоў, вуліц, прафесійныя святы і працоўнага гадавога цыкла. Па колькасці ўстаноў клубы займаюць другое месца пасля бібліятэк. У цэлым па рэспубліцы назіраецца скарачэнне сеткі клубаў: з 1990 па 2006 г. скасаваны 1 192 клубы, якія па шэрагу прычын з'яўляліся недзеяздольнымі. Аднак колькасць працуючых, у адрозненне ад бібліятэк, давала дынаміку росту ва ўсе гады і толькі ў 2006 г. адбылося невялікае змяншэнне. У цэлым, адбываецца ўзбуйненне клубных устаноў, што з'яўляецца прыцягальным для маладых спецыялістаў.

Абраны для даследавання перыяд – гэта час пошуку ў практыцы і абагульненняў у тэорыі новых тыпаў устаноў арганізацыі вольнага часу, іх станаўлення і развіцця. Відавочны станоўчыя прыклады: дзейнічаюць 87 цэнтраў рамёстваў і промыслаў, 70 цэнтраў культуры і вольнага часу, 63 цэнтры фальклору і нацыянальных культур [1]. Усе гэтыя ўстановы па сутнасці сваёй з'яўляюцца аб'яднаннямі некалькіх кірункаў культурна-асветнай дзейнасці, яны здольны задавальняць шматлікія патрэбы. Маем падставы разлічваць на далейшы рост іх колькасці, таксама як і пра з'яўленне новых відаў устаноў гэтага тыпу. Вызначаецца неабходнасць рэфармавання клубаў ад уніфікаванай установы «з рэгламентаваным рэжымам сацыяльна-творчай актыўнасці» да клуба – шматфункцыянальнай, мнагапрофільнай установы, прыстасаванай да ладу жыцця насельніцтва рэгіёну, у якой ствараюцца ўмовы для духоўнага і фізічнага станаўлення асобы ў адпаведнасці з яе самасвядомасцю, улічваюцца штодзённыя клопаты і праблемы свайго асяроддзя [2] (табліца 2).

*Кадры бібліятэк* забяспечваюць захаванне і распаўсюджванне культурных каштоўнасцей, задавольваюць інфармацыйныя, культурныя, навуковыя патрэбнасці карыстальнікаў. У бібліятэках ствараюцца агульнадаступныя Internet-класы, развіваюцца камп'ютэрныя сістэмы з выкарыстаннем CD-ROM дыскаў. 70 % публічных бібліятэк працуюць у аўтаматызаваным рэжыме. У 64 % бібліятэк адкрыты публічныя цэнтры прававой інфамацыі (ПЦПІ) са свабодным доступам грамадзян да эталоннага банка даных прававой інфармацыі Рэспублікі Беларусь (ЭБДПІ) і афіцыйных выданняў Нацыянальнага цэнтра прававой інфармацыі (НЦПІ).

Сярод устаноў культуры бібліятэкі складаюць найбольшую групу. Спецыялісты бібліятэк займаюць другі радок па колькасці. Гэта пятая частка (20,9 %) працуючых у галіне культуры. У сетцы бібліятэк таксама адбываецца скарачэнне ўстаноў (з 1990 па 2006 – 1 331 адзінка), асабліва ў сельскай мясцовасці «ў сувязі з пастаянным змяншэннем сельскага насельніцтва». Для захавання бібліятэчнага абслугоўвання актывізуецца прымяненне бібліёбусаў [3].

Скарачэнне ўстаноў выклікала паступовае змяншэнне агульнай колькасці пасад спецыялістаў, разам з тым у працэнтных адносінах павялічылася колькасць спецыялістаў з вышэйшай адукацыяй, у тым ліку з профільнай, а таксама сярэдняя колькасць работнікаў у адной установе.

Параўнаем з 1970 г.: у той час было толькі 786 спецыялістаў з вышэйшай бібліятэчнай адукацыяй, што складала 13,5 % ад агульнай колькасці спецыялістаў [4]. За тры дзесяцігоддзі адбылося павелічэнне спецыялістаў з вышэйшай бібліятэчнай адукацыяй у 3,6 раза.

Знакавым з'явілася будаўніцтва Нацыянальнай бібліятэкі па навейшых навукова-тэхнічных стандартах, што дазволіць ажыццявіць перспектыўную кадравую накіраванасць бібліятэчнай справы. У сувязі з гэтым была пашырана падрыхтоўка спецыялістаў па спецыяльнасці «Бібліятэказнаўства і бібліяграфія» і ўведзена новая спецыялізацыя «Інфармацыйныя рэсурсы Нацыянальнай бібліятэкі» (табліца 3).

*Музейныя кадры* далучаюць насельніцтва да культурных каштоўнасцей, захоўваюць, аднаўляюць, сістэматызуюць, афармляюць іх у тэматычныя экспазіцыі. Практычна кожны раённы цэнтр мае музей. Яны групуюцца наступным чынам: краязнаўчыя (50 %); гістарычныя, у тым ліку этнаграфічныя (17 %); літаратурныя і літаратурна-мемарыяльныя (10 %); мастацтвазнаўчыя (18 %); музеі-запаведнікі (2 %); прыродазнаўчыя (2 %); іншыя (1 %) [5]. Вывучаемы перыяд для музеяў характарызуецца захаваннем іх сеткі, функцыянуюць таксама 57 філіялаў, што ў будучым, магчыма, прывядзе да павелічэння колькасці самастойных музеяў. Павялічылася колькась работнікаў, працуючых у гэтай сферы, прапарцыянальна вырасла колькасць спецыялістаў.

Спецыялісты музеяў – гэта экскурсаводы (ці музейныя педагогі), якія працуюць з музейнай аўдыторыяй, арганізуюць далучэнне да музеяў наведвальнікаў; навуковыя супрацоўнікі, якія выяўляюць, зберагаюць, улічваюць, навукова апрацоўваюць музейныя прадметы, а таксама вядуць экскурсіі. Яны актыўна ўдзельнічаюць у сумесных праектах з рознымі арганізацыямі культуры і адукацыі, грамадскімі арганізацыямі; ствараюць клубы і асацыяцыі сяброў музеяў, што пашырае інфармацыйнае поле музеяў, павышае ўзровень узаемадзеяння ў сацыякультурнай прасторы (табліца 4).

**Інстытут прафесійнай мастацкай творчасці** – аб'яднанне ўстаноў, якія далучаюць людзей да каштоўнасцей тэатральна-відовішчных відаў мастацтва. Палажэннем аб тэатральна-відовішчнай арганізацыі вызначаны асноўныя задачы: зберагаанне каштоўнасцей сусветнай і нацыянальнай культуры; стварэнне і распаўсюджванне разнастайных культурных набыткаў; задавальненне духоўных патрэбнастей насельніцтва [6].

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Табліца 2 – Дынаміка колькасці клубных устаноў і спецыялістаў

| Клубныя ўстановы | 1990 г. | 1995 г. | 1997 г. | 2000 г. | 2002 г. | 2003 г. | 2004 г. | 2006 г. |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| Колькасць клубных устаноў | 5 030 | 4 400 | 4 246 | 4 270 | 4 017 | 3 917 | 3 867 | 3 838 |
| Колькасць спецыялістаў | 8 188 | 8 963 | 9 680 | 10 298 | 10 517 | 10 738 | 10 877 | 10 860 |
| Сярэдняя колькасць на 1 ўстанову | 1,62 | 2,03 | 2,27 | 2,4 | 2,6 | 2,7 | 2,8 | 2,8 |
| Спецыялісты:з сярэдняй спецыяльнай адукацыяй | 3 609<br>44 % | 3 900<br>43,5 % | 4 207<br>43,4 % | 4 474<br>43,4 % | 4 709<br>44,7 % | 4 740<br>44,1 % | 4 920<br>45,2 % | 4 910<br>45,2 % |
| з вышэйшай адукацыяй | 807<br>9,8 % | 1 326<br>14,8 % | 1 406<br>14,5 % | 1 831<br>17,7 % | 1 836<br>17,7 % | 2 050<br>18,4 % | 2 155<br>19,8 % | 2 148<br>19,8 % |

Табліца 3 – Дынаміка колькасці бібліятэк і спецыялістаў

| Бібліятэкі | 1990 г. | 1995 г. | 1997 г. | 1999 г. | 2002 г. | 2003 г. | 2004 г. | 2006 г. |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| Колькасць устаноў | 5 546 | 4 882 | 4 778 | 4 765 | 4 459 | 4 327 | 4 263 | 4 215 |
| Колькасць спецыялістаў | 9 962 | 9 224 | 9 422 | 9 664 | 9 549 | 9 411 | 9 410 | 9 500 |
| Сярэдняя колькасць спецыялістаў на 1 ўстанову | 1,8 | 1,8 | 1,9 | 2,0 | 2,1 | 2,1 | 2,2 | 2,2 |
| Спецыялісты з сярэдняй спецыяльнай адукацыяй | 4 407<br>44,2 % | 3 961<br>42,9 % | 3 901<br>41,4 % | 4 043<br>41,8 % | 4 036<br>42,2 % | 4 002<br>42,5 % | 3 928<br>41,7 % | 3 970<br>41,7 % |
| Спецыялісты з вышэйшай адукацыяй | 3 098<br>31,1 % | 3 519<br>38,1 % | 3 581<br>38 % | 3 739<br>38,6 % | 3 755<br>39,3 % | 3 805<br>40,4 % | 3 807<br>40,4 % | 3 865<br>40,6 % |

Табліца 4 – Дынаміка колькасці музеяў і спецыялістаў

| Музеі | 1990 г. | 1995 г. | 1997 г. | 1999 г. | 2002 г. | 2003 г. | 2004 г. | 2006 г. |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| Колькасць музеяў | 111 | 141 | 131 | 130 | 128 | 131 | 133 | 138 |
| Усяго працуючых | 1 897 | 2 169 | 2 386 | 2 559 | 2 891 | 2 950 | 2 971 | 3 133 |
| Сярэдняя колькасць работнікаў на 1 ўстанову | 17,1 | 15,3 | 18,2 | 19,6 | 21,6 | 22,5 | 22,3 | 22,7 |
| На пасадах спецыялістаў | 692 | 799 | 880 | 883 | 885 | 896 | 1 127 | 1 140 |
| Колькасць спецыялістаў з вышэйшай адукацыяй | 521<br>75,2 % | 500<br>62,5 % | 608<br>69 % | 619<br>69 % | 612<br>58,4 % | 614<br>68,5 % | 725<br>64,3 % | 738<br>64,7 % |

*Тэатральныя кадры* канцэнтруюць значныя творчыя рэсурсы і ўплываюць уздзейнічаюць на эстэтычныя густы насельніцтва. Тэатральнае мастацтва спалучае сродкі выразнасці літаратуры, музыкі, жывапісу, танца, архітэктуры і ставіць высокія патрабаванні да мастацка-творчага персаналу. Сярод яго адзін з галоўных – акцёр, непасрэдны выразнік драматычнага дзеяння, які стварае сцэнічны вобраз, выкарыстоўваючы свой інтэлект, тэмперамент, эмоцыі, міміку, голас, рухі, жэсты, пластыку цела. Адказнай і складанай з'яўляецца прафесія рэжысёра – «вытлумачальніка» п'есы, творчага кіраўніка пастаноўкі. Ён павінен знітаваць усе элементы спектакля, выявіць аўтарскую задуму і ў сваёй інтэрпрэтацыі вызначыць манеру акцёрскага выканання, вырашыць спектакль у часе і прасторы. У музычным тэатры яшчэ больш ускладняюцца задачы: у якасці асноўных элементаў з'яўляюцца вялікі сімфанічны аркестр і хор, спевакі (опера) і танцоўшчыкі (балет). Галоўным інтэрпрэтатарам музычна-сцэнічнага відовішча з'яўляецца дырыжор.

Мастацтва тэатра патрабуе высокага ўзроўню агульнай гуманітарнай адукацыі і спецыяльных уменняў і навыкаў, высокага ўзроўню прафесійнай падрыхтоўкі як мастацка-артыстычнга персаналу, так і творча-тэхнічнага. Назіраецца ўстойлівая тэндэнцыя прыросту спецыялістаў у тэатрах.

Сярэдняя колькасць мастацка-артыстычнага персаналу вагаецца ў межах 45 % ад агульнай колькасці працуючых. Аднак калі ў Нацыянальным Вялікім тэатры оперы мастацка-артыстычны персанал складае амаль 70 % (што звязана перш за ўсё са значнай колькасцю сімфанічнага аркестра і хору), то ёсць тэатры са значна меншай колькасцю творчых работнікаў, якая даходзіць да 35 %. Кадравы склад тэатраў мае высокі ўзровень адукацыі: разам сярэднюю спецыяльную і вышэйшую адукацыю маюць 93 % спецыялістаў (табліца 5).

*Кадры канцэртных устаноў* забяспечваюць канцэртнае абслугоўванне насельніцтва: дзейнічаюць больш чым 70 аркестраў, ансамбляў і канцэртных брыгад. Яны мабільныя, шмат гастралююць нават у самых аддаленых населеных пунктах краіны. Ладзяцца музычныя фестывалі, якія дэманструюць лепшыя ўзоры музычнага і харэаграфічнага мастацтва.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Табліца 5 – Дынаміка колькасці тэатраў і спецыялістаў

| Тэатральныя ўстановы | 1990 г. | 1995 г. | 1997 г. | 1999 г. | 2002 г. | 2004 г. | 2006 г. |
|---|---|---|---|---|---|---|---|
| Колькасць тэатраў | 21 | 24 | 26 | 27 | 27 | 27 | 28 |
| Усяго працуючых | | 2 866 | 2 717 | 2 960 | 3 255 | 3 498 | 3 374 |
| Сярэдняя колькасць работнікаў на 1 ўстанову | | 119,4 | 104,5 | 107 | 120 | 129 | 135 |
| З іх мастацка-артыстычны персанал | 1 220 | 1 245 | 1 195 | 1 235 | 1 376 | 1 656 | 1 594 |
| % ад ўсіх працуючых | | 43 | 44 | 43 | 42,2 | 47,3 | 47,3 |
| з іх з сярэдняй спецыяльнай адукацыяй | 452<br>37 % | 557<br>37 % | 374<br>26,4 % | 560<br>37 % | 518<br>30,6 % | 445<br>22,3 % | 500<br>31,3 % |
| з вышэйшай адукацыяй | 644<br>52,8 % | 809<br>53,7 % | 845<br>59,8 % | 908<br>60 % | 862<br>51 % | 1 036<br>52 % | 991<br>62,1 % |

Табліца 6 – Дынаміка колькасці канцэртных арганізацый і спецыялістаў

| Канцэртныя арганізацыі | 1990 г. | 1995 г. | 1997 г. | 1999 г. | 2002 г. | 2004 г. | 2006 г. |
|---|---|---|---|---|---|---|---|
| Колькасць устаноў | 12 | 13 | 13 | 13 | 13 | 15 | 16 |
| Усяго працуючых | 1 416 | 1 520 | 1 630 | 1 727 | 1 777 | 1 979 | 2 025 |
| З іх мастацка-артыстычнага персаналу | 922 | 1 014 | 1 142 | 1 178 | 1 278 | 1 425 | 1 455 |
| % ад усяго | 65,1 | 66,7 | 70 | 68 | 71 | 72 | 71,8 |
| з іх з вышэйшай адукацыяй | 180<br>19,5 % | 632<br>57,5 % | 588<br>49,0 % | 686<br>53 % | 708<br>55,3 % | 755<br>52,9 % | 763<br>52,4 % |
| з сярэдняй спецыяльнай адукацыяй | 198<br>21,5 % | 394<br>35,8 % | 477<br>39,8 % | 525<br>40,5 % | 570<br>44,6 % | 670<br>47 % | 690<br>47,4 % |

Кадравы састаў канцэртных арганізацый разнастайны. Артыстычны персанал складаюць артысты аркестраў і ансамбляў, балета, хора, акампаніятарыканцэртмайстры, лектар-мастацтвазнаўца (музыказнаўца). Пасады мастацкага персаналу – дырыжоры, балетмайстры, хормайстры, рэжысёры і гукарэжысёры, рэпетытары, мастакі (грымёры, пастаноўшчыкі, па святлу), яны патрабуюць спецыялістаў з грунтоўнымі ведамі і навыкамі, са значнай прафесійнай падрыхтоўкай для забеспячэння мастацкага ўзроўню рэпертуару, фарміравання і задавальнення патрэбнасці насельніцтва ў сцэнічным і музычным мастацтве. Пры амаль нязменнай колькасці канцэртных устаноў значна ўзрасла агульная колькасць працуючых, адпаведна і мастацка-артыстычнага і абслуговага персаналу.

Павялічылася колькасць спецыялістаў з вышэйшай адукацыяй, асабліва заўважаны рост з 1990 г.: праз пяць гадоў спецыялістаў гэтага ўзроўню стала ўтрая болей, рост – з 19,5 % да 57,5 % ад агульнай колькасці працуючых спецыялістаў. Папаўненне кадраў ішло таксама за кошт спецыялістаў з сярэдняй спецыяльнай адукацыяй. Агульны прырост спецыялістаў склаў двайное павелічэнне на працягу дзесяці гадоў. Узрос адукацыйны ўзровень маючых спецыяльную адукацыю: з 41 % да 99,8 %. Гэта самы высокі паказчык па галіне культуры. Мае месца таксама станоўчая тэндэнцыя прыросту спецыялістаў з профільнай адукацыяй: гэта выпускнікі Беларускай дзяржаўнай акадэміі музыкі, Беларускага дзяржаўнага універсітэта культуры, музычных вучылішчаў і вучылішчаў культуры (табліца 6).

**Сістэма адукацыі ў сферы культуры** выконвае сацыяльныя, палітычныя і эканамічныя функцыі. Служыць «крыніцай для папаўнення арміі працы», сістэмай падрыхтоўкі кваліфікаваных кадраў для ўстаноў культуры і іх далейшага развіцця, стварае ўмовы для авалодання рознымі відамі мастацтва, выхаванне творчых асоб.

*Кадры навучальных устаноў* – найбольш кваліфікаваная сацыяльная супольнасць, здольная рухаць наперад культуру і, галоўнае, раскрываць сакрэты творчасці моладзі, якая абрала прафесію ў сферы культуры.

*У вышэйшых навучальных установах* прафесарска-выкладчыцкі састаў мае выключна вышэйшую адукацыю, у значнай частцы гэта дзеючыя практыкі: выканаўцы на канцэртнай і тэатральнай сцэне, у кіно і на тэлебачанні, пастаноўшчыкі спектакляў, кінаі відэафільмаў, аўтары музыкі, літаратурных твораў, жывапісных і графічных палотнаў, скульптур, манументальна-дэкаратыўных кампазіцый. У сістэме ВНУ працуе 15 народных артыстаў, мастакоў, 47 заслужаных артыстаў, дзеячаў мастацтваў і культуры, работнікаў адукацыі.

З 666 штатных выкладчыкаў ВНУ культуры 235 маюць вучоныя званні (даныя 2006 г.), што складае 35,3 % ад агульнай колькасці штатных работнікаў. Якаснай характарыстыкай ВНУ можа быць суадносенне колькасці выкладчыкаў з вучонымі званнямі



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

да колькасці студэнтаў. У БДПУ адзін прафесар (дацэнт) прыходзіцца на 40 студэнтаў (завочная форма навучання дасягае паловы агульнага кантынгенту), адзін выкладчык – на 14 студэнтаў. Меншая колькасць студэнтаў выпадае на аднаго выкладчыка ў БДА музыкі, што тлумачыцца перавагай індывідуальных заняткаў у вучэбна-выхаваўчым працэсе, неабходных для засваення складанага музычнага мастацтва, а таксама адсутнасцю завочнай формы навучання (дзе на аднаго выкладчыка плануецца болей студэнтаў) (табліца 7).

Табліца 7 – Суадносіны колькасці выкладчыкаў з вучонымі званнямі і студэнтаў

| Установы | Колькасць студэнтаў | | Колькасць прафесараў і дацэнтаў | | Колькасць студэнтаў на 1 прафесара (дацэнта) | | Колькасць выкладчыкаў | | Колькасць студэнтаў на 1 выкладчыка | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | *1997 г.* | *2004 г.* | *1997 г.* | *2004 г.* | *1997 г.* | *2004 г.* | *1997 г.* | *2004 г.* | *1997 г.* | *2004 г.* |
| БДУКіМ | 3 449 | 4 176 | 112 | 96 | 30,7 | 37 | 300 | 325 | 11,4 | 12,8 |
| БДА музыкі | 889 | 1 029 | 90 | 99 | 9,8 | 9,7 | 189 | 177 | 4,7 | 5,1 |
| БДА мастацтваў | 649 | 1 121 | 31 | 40 | 20,9 | 23 | 106 | 133 | 6,1 | 7,3 |

Даныя табліцы сведчаць, што ў БДУКіМ і БДА мастацтваў амаль кожны трэці выкладчык, а ў БДА музыкі – кожны другі выкладчык мае званне прафесара ці дацэнта. У сярэднім сярод ВНУ сістэмы Мінадукацыі званне прафесара ці дацэнта мае кожны трэці выкладчык і такім чынам паказчыкі БДА музыкі з'яўляюцца найлепшымі сярод вышэйшых навучальных устаноў краіны.

Па колькасці выкладчыкаў, якія маюць вучоныя ступені, лідзіруе БДУ культуры і мастацтваў (далей БДУКіМ) – 33,3 %. Колькасць дактароў навук трымаецца на адным узроўні, а колькасць кандыдатаў навук з 1991 г. зменшылася. У БДА музыкі выкладчыкаў з вучонымі ступенямі – 20,4 %, у БДА мастацтваў – 12,8 %. У цэлым па сістэме Мінкультуры выкладчыкаў з вучонымі ступенямі – 25,6 %, што ніжэй паказчыка па сістэме Мінадукацыі – 43 %.

*Кадравы склад сярэдніх спецыяльных навучальных устаноў* вызначаны спецыялістамі з вышэйшай профільнай адукацыяй на 85 %. Да выкладання дысцыплін запрашаецца даволі вялікая колькасць сумяшчальнікаў (да 20 %) – гэта спецыялісты-практыкі, якія працуюць у культурна-асветных і тэатральна-відовішчных установах, а таксама ў вышэйшых навучальных установах. З 2004 г. да выкладання агульнаадукацыйных прадметаў таксама далучаюцца сумяшчальнікі, паколькі ўведзены (на падставе дзяржаўнага стандарту) прыродазнаўчыя дысцыпліны у вучэбныя планы ССНУ культуры (матэматыка, фізіка, хімія).

Узровень адукацыі выкладчыкаў адрозніваецца па абласцях: калі ў г. Мінску спецыялісты з вышэйшай адукацыяй складаюць 94,9 % (а ў гімназіі-каледжы пры БДА музыкі – 100 %), Гродзенскай вобласці – 90,4 %, то ў Мінскай вобласці – 73,2 %. Яшчэ большая розніца ў асобных навучальных установах. Калі Мінскае музычнае вучылішча мае спецыялістаў з вышэйшай адукацыяй 99,4 %, Мінскае мастацкае вучылішча – 97,9 %, то Мінскае вучылішча мастацтваў – 72,5 %, Беларускі дзяржаўны харэаграфічны каледж – 66,1 %.

*У дзіцячых школах мастацтваў*, якія зяўляюцца пазашкольнымі ўстановамі, прадстаўлены спецыялісты па выкладанні ўсіх відаў мастацтва: музычнага, харэаграфічнага, тэатральнага, выяўленчага, народнага. Яны ажыццяўляюць важную задачу эстэтычнага выхавання: выяўляюць і развіваюць мастацкія здольнасці дзяцей, рыхтуюць найбольш таленавітых да паступлення ў прафесійныя навучальныя ўстановы культуры. Аднак толькі каля 40 % штатных выкладчыкаў мае вышэйшую адукацыю, асноўная адукацыя спецыялістаў гэтых устаноў – сярэдняя спецыяльная. У залежнасці ад відаў мастацтва колькасць выкладчыкаў дзіцячых школ мастацтваў з вышэйшай адукацыяй павышаецца ў мастакоў да 66 % ці памяншаецца ў харэографаў да 32 %, у народных майстроў нават да 23 %. Большая частка выкладчыкаў працуе ў музычных школах (53 %).

Па абласцях гэтыя даныя вельмі адрозніваюцца. Найменшая колькасць штатных выкладчыкаў, што маюць вышэйшую адукацыю, у Брэсцкай і Гродзенскай абласцях – 32 %, у Мінскай вобласці – 40 %. Па-за конкурсам зноў г. Мінск – тут працуе 74 % выкладчыкаў з вышэйшай адукацыяй.

Палепшыць сітуацыю з забеспячэннем спецыялістамі музычнага профілю ў рэгіёнах змогуць філіялы БДА музыкі, якія з 2003 г. працуюць ва ўсіх абласцях і ў бліжэйшы час іх выпускнікі папоўняць як мясцовыя ССНУ, так і дзіцячыя школы мастацтваў.

**Вывады**

Статыстычныя звесткі апошніх гадоў (1990–2006 гг.) дазваляюць засведчыць станоўчую дынаміку ўдасканалення кадравага саставу арганізацый культуры. Гэта вынік мэтанакіраванай дзейнасці кіраўніцкіх органаў культуры па фарміраванні якаснай прафесійна-адукацыйнай асновы кадраў культуры. Кадравы склад сферы культуры з'явіўся тым стрыжнем, які забяспечыў не толькі захаванне культурнай прасторы краіны, але і яе якаснае напаўненне. Ажыццяўлялася арганізацыя і запаўненне сферы вольнага часу шматлікімі відамі і формамі сацыяльна-культурнай дзейнасці як на прафесійнай, так і самадзейнай аснове. Кадры культуры выконваюць шматлікія функцыі, сярод якіх: культурная асвета; эстэтычнае і мастацкае выхаванне; святочна-обрадавыя мерапрыемствы; ахова і выкарыстанне помнікаў гісторыі і культуры; арганізацыя вольнага часу (пазнавальнага, відовішчна-гульнявога адпачынку), забеспячэнне рэкрэацыі і культурных зносін; развіццё мастацкай і прыкладной творчасці. Шырокае поле сацыяльна-культурнай дзейнасці патрабуе значнай прафесійнай адказнасці ад работніка культуры.

Дзяржава, ажыццяўляючы культурную палітыку, зацікаўлена ў высокім прафесійным узроўні кадраў

РЭПАЗІТОРЫЙ БГУКІ

культуры, таму значная ўвага надаецца ўдасканаленню сістэмы адукацыі ў краіне, павышаюцца патрабаванні да адукацыйнага ўзроўню спецыялістаў, уводзіцца іх матэрыяльнае стымуляванне ў залежнасці ад узроўню адукацыі, падтрымліваецца і патрабуецца сістэматычнае павышэнне кваліфікацыі спецыялістаў і кіруючых работнікаў.

## Літаратура


1. *Чэрнік, В.* Сацыякультурная функцыя клубаў: абкультурыць соцыум / В. Чэрнік // Культура. – 2006. – 2–8 снеж. – С. 3.
2. *Макарова, Е.А.* К итогам социологического исследования «Роль клубных учреждений в удовлетворении культурных потребностей населения регионов Беларуси» / Е.А. Макарова // Аператыўная інфармацыя па праблемах культуры і мастацтва. – 1997. – Вып. 1. – С. 44–51.
3. *Шышкін, У.* Бібліятэка XXI стагоддзя: стымул да дасканаласці ў формуле ўдасканальвання / У. Шышкін // Культура. – 2006. – 25 ліст. – 1 снеж. – С. 3.
4. *Пакала, М.І.* Гісторыя бібліятэчнай справы ў БССР / М.І. Пакала. – Мінск, 1986.
5. Беларуская культура сёння. Гадавы агляд і статыстычны партрэт культуры Беларусі / БелДІПК. – Мінск, 2004.
6. Положение о театрально-зрелищной организации Республики Беларусь // Нац. реестр правовых актов Респ. Беларусь. – 2005. – № 3. – С. 131–134.



## Summary

Modern dynamics (changes) of personnel system of culture in interrelations with institutes of cultural work with the population and professional art creativity in the making period of the sovereignty of the Republic Belarus are considered.


08.04.2008

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ